УДК 378.148

# ВУЧЭБНАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ: ПАТЭНЦЫЯЛ ІНТЭГРАЦЫІ Ў АДУКАЦЫЙНАЕ АСЯРОДДЗЕ ВА ЎМОВАХ АДСУТНАСЦІ МЕДЫЯСПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ

***С. В. Венідзіктаў***

*Магілёўскі вышэйшы каледж Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь (Рэспубліка Беларусь)*

*У артыкуле прыводзіцца тэарэтычная мадэль інтэграцыі вучэбнага тэлебачання ў адукацыйны працэс ва ўмовах адсутнасці медыяспецыялізацыі, аналізуецца вопыт яе практычнай рэалізацыі ў Магілёўскім вышэйшым каледжы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, раскрываецца патэнцыял тэлевізійнай лабараторыі ў развіцці медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці навучэнцаў.*

***Educational TV: potential for integration into the educational environment in the absence of media specialization***

*The article presents a theoretical model of integration of educational television in the educational process in the absence of media specialization, analyzes the experience of its practical implementation in Mogilev Higher College of Ministry of Internal Affairs of the Republic of Belarus, reveals the potential of television laboratory in the development of students' media communicative competence.*

Сучаснае грамадства, якое называюць інфармацыйным, з'яўляецца адлюстраваннем новага спосабу існавання асобы ў сістэме шматаспектнай грамадзянскай камунікацыі. Геаметрычнае ўзрастанне і змяненне характару плыняў інфармацыі значна пераўзыходзіць магчымасці свядомага яе ўспрыняцця індывідам. Адначасова вырастае аб'ектыўная залежнасць узроўню сацыяльнай устойлівасці і прафесійнай паспяховасці грамадзяніна ад валодання ім першаснымі навыкамі медыякрытычнай дзейнасці – т. зв. медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці.

Масавая інфармацыя хутка пераўтварылася з напаўсакральнага прадукту закрытага функцыянавання сродкаў масавай камунікацыі ў феномен калектыўнай (і пераважна – бессвядомай) дзейнасці масавай аўдыторыі. Атрымаўшы амаль неабмежаваны доступ да інфармацыйных рэсурсаў, «сярэдні» грамадзянін не здольны выразна ўявіць, якім чынам функцыянуе медыйная прастора, якімі фактарамі прадвызначаецца яе напаўненне і чым выклікаецца скажэнне медыяпаведамленняў. Разам з тым названыя кампетэнцыі з'яўляюцца вырашальнымі і шмат у чым базавымі кампанентамі асобы

т. зв. «чалавека камуніцыруючага», які зараз уступае ў новы тып міжасобасных адносін і стасункаў са светам фармальных сістэм.

Названыя тэндэнцыі прадвызначаюць неабходнасць акрэслення новых патрабаванняў да зместу навучальнага працэсу, а таксама да яго філасофіі. Неабходнасць у механічнай перадачы стандартызаванага багажу вучэбнай інфармацыі, актуальная яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму, зараз змянілася на патрэбу ў засваенні навучэнцамі метадаў і форм самастойнага атрымання і крытычнага асэнсавання разнастайных звестак. Мы перакананы, што эфектыўным дадзены працэс можа быць выключна ў выпадку стварэння аптымальнай сістэмы ўзаемадзеяння адукацыйнага / акадэмічнага асяроддзя і медыяпрасторы, якая выступае не толькі ў якасці сферы цыркуліравання масавых інфармацыйных плыняў, але і ў якасці новага асяроддзя сацыялізацыі навучэнцаў (напрыклад, прававой, культурнай ці грамадзянскай). Гэта можа праяўляцца як у вывучэнні практыкі сродкаў масавай інфармацыі, стварэнні шырокіх медыяадукацыйных курсаў, так і ў арганізацыі ў навучальных установах markdown рознага ўзроўню ўласных медыяструктур (інфармацыйных, забаўляльных і інш.), а таксама навучальных і навукова-даследчых лабараторый. Задача значна спрашчаецца ва ўстановах вышэйшай адукацыі, якія маюць медыяспецыялізацыю. Аднак наша даследаванне дазволіла выявіць значны патэнцыял інтэграцыі ўласных медыя ў навучальнае асяроддзе т. зв. «няпрофільных» навучальных устаноў. У першую чаргу гэта датычыць тэлебачання, якое, нягледзячы на ўзрастанне значэння інтэрнэт-вяшчання, застаецца найбольш уплывовым сярод электронных СМІ, выступаючы своеасаблівым пасрэднікам паміж традыцыйнымі друкаванымі медыя (якія паступова страчваюць пазіцыі) і новай канвергентнай журналістыкай. Аператыўнасць, масавасць, тэхналагічнасць і візуальная напаўняльнасць робяць адукацыйнае тэлебачанне надзвычай прывабнай для навучэнцаў сферай прыкладання творчых і інтэлектуальных сіл, а паралельна – асяроддзем развіцця медыякампетэнцый, пра якія ішла гаворка вышэй.

Эмпірычнай базай гэтага даследавання стала дзейнасць лабараторыі вучэбнага тэлебачання, арганізаванай пры кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Магілёўскага вышэйшага каледжа МУС Рэспублікі Беларусь у 2012 г. У тэхнічным плане лабараторыя ўяўляе сабой комплекс «вытворчы цэнтр – цэнтр медыякамунікацыі», абсталяваны відэазапісваючай і камп’ю-тарнай тэхнікай, якая забяспечвае поўны цыкл вытворчасці відэапрадукцыі, сістэмай відэаканферэнцсувязі для правядзення вэб-семінараў і канферэнцый,

а таксама абсталяваннем для прэс-канферэнцый і прэзентацый. У арганізацыйным плане лабараторыя ўключае ў сябе кіраўніка з ліку супрацоўнікаў кафедры, які мае спецыяльную адукацыю і вопыт працы ў тэлевізійнай журналістыцы, а таксама найбольш здольных курсантаў (5–7 чалавек).

Укараненне ў адукацыйны працэс вышэйшага каледжа тэлевізійных тэхналогій накіравана на: забеспячэнне навучальнай установы аўдыя-візуальнымі дыдактычнымі матэрыяламі; аптымізацыю працэсу выкладання дысцыплін, якія ўтрымліваюць значны аб’ём візуальнай інфармацыі; інфармацыйную інтэграцыю ў лакальную медыяпрастору; дадатковую сацыялізацыю і развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў; фарміраванне станоўчага іміджу навучальнай установы інфармацыйнымі сродкамі.

У дзейнасці лабараторыі вучэбнага тэлебачання неабходна ўлічвасць шэраг фактараў, выкліканых адсутнасцю медыяспецылізацыі і агульнай скіраванасцю адукацыйнага працэсу ў навучальнай установе сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў:

1. Кадравыя праблемы: штатнае камплектаванне каледжа не прадугледжвае наяўнасці сярод прафесарска-выкладчыцкага складу супрацоўнікаў, якія маюць спецыяльную медыяадукацыю.

2. Факультатыўны характар: дзейнасць лабараторыі вучэбнага тэлебачання, у якую ўцягнутыя курсанты, першапачаткова не прадугледжана ўнутраным статутам і рэгулюецца Палажэннем, зацверджаным начальнікам вышэйшага каледжа, у сувязі з чым арганізацыя здымачнага працэсу і ўдзелу ў ім курсантаў патрабуе дадатковых узгадненняў.

3. Сфарміраванае ў масавай аўдыторыі ўяўленне адносна закрытага характару навучальнай установы, выкліканае колішнім дэфіцытам навін аб навучальнай установе ў рэгіянальных сродках масавай інфармацыі, а таксама афіцыйным, пратакольным характарам паведамленняў.

4. Адсутнасць у іншых установах вышэйшай адукацыі відэапрадукцыі, якая магла б вызначыць аптымальны фармат для вучэбных фільмаў па дысцыплінах, што маюць вузкае спецыяльнае альбо прыкладное значэнне ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў для органаў унутраных спраў.

5. Неабходнасць арганізацыі дзейнасці лабараторыі «з нуля», ва ўмовах адсутнасці прававой базы, арганізацыйнай структуры, кадравага і тэхнічнага забеспячэння.

6. Умовы адначасовага рашэння некалькіх задач, якія паўсталі перад лабараторыяй: адукацыйных, навукова-метадычных, інфармацыйных і іміджавых.

Кадравае пытанне намі было вырашана шляхам арганізацыі для найбольш здольных курсантаў факультатыўных заняткаў па асновах тэхнікі і тэхналогіі тэлебачання (відэаздымкі, мантаж, рэжысура, капірайтынг і г. д.). Дадзены папярэдні этап быў рэалізаваны на працягу шасці месяцаў. У выніку ў вышэйшым каледжы сфарміраваныя дзве творчыя групы (па тры курсанты ў кожнай), здольныя аўтаномна працаваць над праектамі.

Рэалізацыя вучэбнага накірунку дзейнасці лабараторыі была распачата з вывучэння патрэб кафедраў у дыдактычным відэаматэрыяле, што выклікала неабходнасць пераасэнсавання існуючых праграм і перагляду вучэбных курсаў. Наша даследаванне паказала, что больш за 50 % лекцыйных тэм па прававых дысцыплінах, а таксама па дысцыплінах гуманітарнага цыклу патрабуюць дадатковай візуалізацыі матэрыялу, аднак не маюць мэтанакіравана падрыхтаваных медыяматэрыялаў, якія б адпавядалі праграме і адлюстроўвалі спецыфіку падрыхтоўкі кадраў для органаў унутраных спраў. У гэтай сувязі наяўнасць уласнага медыяпадраздзялення, здольнага ва ўзаемадзеянні з прафесарска-выкладчыцкім складам ствараць якасны медыяпрадукт, безумоўна, больш поўна адпавядае патрэбам медыятызацыі адукацыйнага асяроддзя. Прыкладамі вучэбнай прадукцыі з’яўляюцца відэафільмы «Тактыка агляду і дагляду паветраных судоў», «Зносіны ва ўмовах камунікатыўнага супрацьдзеяння», «Асобы без сталага месца жыхарства», «Выкананне стралковых практыкаванняў» і да т. п.

Асаблівасцю дыдактычнага відэа, падрыхтаванага лабараторыяй, з’яўляецца яго модульная пабудова: часткі фільмаў могуць быць выкарыстаны ў якасці асобных завершаных сюжэтаў, відэазадач, інструкцый. Падобныя модулі мэтазгодна ўключаць у склад электронных вучэбна-метадычных комплексаў, якія ў дадзены момант актыўна распрацоўваюцца па ўсіх дысцыплінах і размяшчаюцца на інфармацыйна-адукацыйным партале вышэйшага каледжа. Сцэнары вучэбных відэафільмаў праходзяць працэдуру ўзгаднення з кіраўніком структурнага падраздзялення, кіраўніком лабараторыі вучэбнага тэлебачання і першым намеснікам начальніка вышэйшага каледжа, пасля якой прымаюцца да рэалізацыі. У стварэнні сцэнараў таксама задзейнічаны курсанты, якія адначасова ўяўляюць мэтавую групу відэафільмаў, што дазваляе больш поўна рэалізаваць прынцып уліку аўдыторных інтарэсаў.

Эфектыўнасць укаранення ў вучэбны працэс дыдактычнай відэапрадукцыі ўласнай вытворчасці не выклікае сумненняў. Гэта абумоўлена як агульнымі заканамернасцямі ўспрыняцця і засваення інфармацыі (задзейнічаны адразу некалькі каналаў камунікацыі), так і адносна абстрактным характарам профільных дысцыплін ведамаснай установы, які ўскладняе ўспрыняцце тэарэтычнага матэрыялу ў выпадку адсутнасці візуальнай адпрацоўкі. Даследчыкі адзначаюць, што ўменне выкарыстоўваць вобразы ў якасці інструментаў думкі з'яўляецца надзённым для сучаснага прафесіянала, незалежна ад сферы спецыялізацыі, таму перад адукацыяй паўстае задача павышэння мульцімадальнай граматнасці, якая б яб'ядновала у сабе як традыцыйныя яе віды (вербальныя і тэкставыя), так і найноўшыя дыгітальныя (аўдыявізуальныя, альбо лічбавыя).

Як бачым, ва ўмовах адсутнасці медыяспецыялізацыі рэалізацыя вучэбнага накірунку дзейнасці лабараторыі сутыкаецца толькі з кадравымі цяжкасцямі, вырашэнне якіх з'яўляецца першачарговай задачай. Больш праблемнай ўяўляецца інфармацыйны складнік, звязаны з развіццём у курсантаў вузкаспецыяльных кампетэнцый журналісцкай дзейнасці. Апошнія неабходныя як для падрыхтоўкі ўласнай інфармацыйнай праграмы, што адлюстроўвае падзеі, якія адбыліся за пэўны перыяд у вышэйшым каледжы, так і для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з рэгіянальнымі сродкамі масавай інфармацыі. На наш погляд, у дадзенай сферы крыецца найбольшы патэнцыял тэлевізійнай лабараторыі ў развіцці медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці навучэнцаў. Сама адносна «закрытая» навучальная ўстанова ўяўляе сабой удалую мадэль цыркулявання інфармацыі ў лакальнай супольнасці, дзе індывіды могуць прасачыць за ўсім ланцужком ад падзеі да яе адлюстравання і інтэрпрэтацыі ў СМІ, ацаніць адпаведнасць арыгіналу і яго медыйнага адлюстравання, прычыны скажэнняў звестак і іх наступствы. У гэтых адносінах можна вылучыць тры ўмоўныя групы навучэнцаў:

1) г. зв. «ньюсмэйкеры» – найбольш сацыяльна актыўныя курсанты, пры ўдзеле якіх ствараюцца інфармацыйныя нагоды і адбываюцца значныя падзеі ў сферы адукацыі, навукі, культуры, спорту і г. д.;

2) творчая група лабараторыі вучэбнага тэлебачання, якая сутыкаецца з неабходнасцю інфармацыйнай перапрацоўкі, трансфармацыі падзей згодна з патрабаваннямі тэлевізійнага фармату, а таксама ідэалагічнымі і службовымі інтарэсамі;

3) масавая аўдыторыя (курсанты і супрацоўнікі ўстановы), якая з'яўляецца як удзельнікам падзей, так і спажыўцом канчатковага інфапрадукту.

Менавіта масавая аўдыторыя выступае фокус-групай, на якую накіравана інфармацыйнае ўздзеянне і якая – у значнай ступені *бессвядома* – становіцца асяроддзем медыякамунікатыўнай сацыялізацыі. Экспрэс-апытанні, праведзеныя намі сярод курсантаў вышэйшага каледжа, паказалі, што каля 70 % навучэнцаў самастойна фіксуюць наяўнасць неадпаведнасці падзей у лакальным асяроддзі і іх адлюстравання ў тэлевізійным прадукце, а таксама задумваюцца над прычынамі такой неадпаведнасці. І ў дадзеным выпадку аказваецца неістотным, пра якія інфармацыйныя праграмы ідзе гутарка: унутраныя (транслююцца праз лакальную відэасетку і інтэрнэт-рэсурсы) альбо знешнія (матэрыялы накіроўваюцца на рэгіянальнае тэлебачанне ў гатовым для эфіру выглядзе альбо ў выглядзе рабочага матэрыялу для мантажу і перапрацоўкі). Найбольш шчыльнае супрацоўніцтва арганізавана з Магілёўскім гарадскім тэлебачаннем «2 канал»: толькі за 2013 г. у рэгіянальны эфір выйшла больш за 30 відэасюжэтаў, падрыхтаваных лабараторыяй вучэбнага тэлебачання.

Інфармацыйны накірунак перасякаецца з іміджавым: стабільная кантралюемая прысутнасць вышэйшага каледжа ў медыядыскурсе рэгіёна садзейнічае ліквідацыі інфармацыйных прабелаў і фарміраванню станоўчых адносінаў да ўстановы сярод насельніцтва горада і вобласці. У больш шырокім плане – адбываецца аптымізацыя іміджу ўсіх службаў і падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў, а таксама прававой сістэмы рэспублікі ў цэлым. Неабходна адзначыць яшчэ адзін, хутчэй пабочны, фактар: ужо само стварэнне ў вышэйшым каледжы лабараторыі вучэбнага тэлебачання – падраздзялення новага фармату, якое змяняе ўяўленне адносна функцыянавання навучальнай установы сістэмы МУС – з'явілася дзейсным іміджавым фактарам. Гэта пацвярджаецца ўстойлівым інтарэсам да дзейнасці падраздзялення з боку агульнанацыянальных СМІ. Напрыклад, пачатак рэалізацыі праекту «Нарад па-за чаргой» суправаджаўся серыяй публікацый у рэспубліканскім друку, выхадам сюжэтаў на рэспубліканскіх тэлеканалах, размяшчэннем серый праекту і іх адкрытым абмеркаваннем на вядучых інтэрнэт-рэсурсах.

«Нарад па-за чаргой», які ствараецца лабараторыяй вучэбнага тэлебачання сумесна з Магілёўскім гарадскім тэлебачаннем «2 канал», з'яўляецца прыкладам адначасовай паспяховай рэалізацыі дыдактычных, іміджавых і інфармацыйных задач. У праекце спалучаюцца вучэбны фільм і

інфармацыйна-аналітычная праграма фармату «Live», прысвечаная дзейнасці органаў і падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў. Курсанты, якія выступаюць у ролі вядучых праграмы, «прымяраюць» на сябе будучую прафесію, заступаючы на дзень ва ўмоўны «нарад» разам з найбольш падрыхтаванымі супрацоўнікамі. Праект выходзіць у эфір гарадскога тэлебачання, усе яго серыі даступныя на сайце вышэйшага каледжа, а таксама на сервісе YouTube. Высокі для рэгіянальнага праекту рэйтынг абумоўлены заканамернай цікавасцю аўдыторыі да прававаой сферы, а таксама нестандартным поглядам на работу праваахоўнай сістэмы ў цэлым (у цэнтры ўвагі аказваецца чалавек, а не праблема). Усе 20-хвілінныя серыі (пра дзейнасць участковых інспектараў міліцыі ў горадзе і ў сельскай мясцовасці, транспартнай міліцыі, Дзяржаўтаінспекцыі, Дэпартамента аховы, АМАПа і г. д.) выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе ў якасці ілюстрацыйнага і праблемнага відэаматэрыялу. Іх дыдактычная каштоўнасць абумоўлена напаўдакументальным характарам відэа, праўдападобнасцю і непрадказальнасцю сітуацый, у якія трапляюць вядучыя-курсанты падчас нясення «нарада па-за чаргой». Сумесны праект мае таксама відавочнае іміджавае значэнне, раскрываючы «чалавечы» складнік дзейнасці органаў унутраных спраў.

Аптымізацыі іміджу вышэйшага каледжа таксама садзейнічае творчы накірунак дзейнасці лабараторыі: удзел дакументальных фільмаў і ролікаў сацыяльнай рэкламы ў фестывалях і конкурсах рознага ўзроўню. Напрыклад, у 2014 г. творчая група прыняла ўдзел у XI Міжнародным фестывалі дакументальнага кіно і відэафільмаў «Яраслаўль-2014», дзе атрымала дыплом лаўрэата I ступені. Яшчэ 8 дыпломаў на мерапрыемствах рознага ўзроўню былі атрыманы ў 2013 г. Падобныя падзеі, безумоўна, з’яўляюцца прывабнымі для асвятлення ў СМІ, бо выходзяць за межы ўстойлівага стэрэатыпу курсантаў вышэйшага каледжа, паказваюць іх з нестандартнай пазіцыі. Істотна, што ў рэалізацыі творчага і іміджавага накірункаў не праяўляюцца аб’ектыўныя перашкоды, звязаныя з адсутнасцю медыяспецыялізацыі.

Даследаванне заканамернасцей паспяховай інтэграцыі вучэбнага тэлебачання ў адукацыйнае асяроддзе ва ўмовах адсутнасці медыяспецыялізацыі зараз мае пераважна эмпірычны характар, аднак, на наш погляд, патрабуе дадатковага тэарэтычнага асэнсавання. Перспектыўным уяўляецца стварэнне на базе структурнага падраздзялення навукова-даследчай лабараторыі, якая будзе вырашаць наступныя задачы: вывучэнне дыдактычнага

патэнцыялу сучасных медыятэхналогій; развіццё тэорыя фарміравання медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці ў акадэмічным асяроддзі; распрацоўка аптымальнай мадэлі ўзаемадзеяння СМІ навучальных устаноў з рэгіянальнымі СМІ; даследаванне практыкі дзейнасці электронных медыя ў няпрофільных адукацыйных інстытутах; распрацоўка інфармацыйнай стратэгіі фарміравання станоўчага іміджу навучальнай установы; вывучэнне адукацыйнага медыяасяроддзя як фактара прававой сацыялізацыі; устанаўленне сувязі паміж адукацыйнымі медыя і культурай грамадзянскай камунікацыі; сістэматызацыя жанраў вучэбнай медыяпрадукцыі. Цэнтр медыякамунікацыі кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін можа прэтэндаваць на ролю дыскусійнай пляцоўкі падчас правядзення семінараў, канферэнцый рознага ўзроўню, вэбінараў з удзелам спецыялістаў у вобласці сучаснай медыясферы. У якасці стратэгічнай задачы мэтазгодна разглядаць распрацоўку сбалансаванага факультатыўнага курса па медыяграматнасці, які мог бы з неабходнымі карэктыроўкамі ўкараняцца ў навучальны працэс устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі рознай ведамаснай падначаленасці.

Тэхнічная ўзброенасць лабараторыі дазваляе планаваць пашырэнне сферы дзейнасці з далейшым развіццём прысутнасці медыяпрадукцыі ў інтэрнэт-асяроддзі, а таксама стварэннем арыгінальных адукацыйных інтэрнэт-праектаў з разнастайным аўдыявізуальным напаўненнем. Акрамя ўжо наладжанага супрацоўніцтва з рэгіянальным тэлебачаннем, будзе мэтазгоднай рэалізацыя сучасных адукацыйных праектаў з іншымі навучальнымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь, а таксама інтэрнэт-СМІ і суполкамі ў папулярных сацыяльных сетках.

Таксама трэба будзе вырашыць задачу распрацоўкі аптымальнай мадэлі выкарыстання медыясродкаў у адукацыйным працэсе факультэта завочнага навучання. Зараз ствараемы лабараторыяй вучэбнага тэлебачання відэапрадукт уключаецца ў электронныя вучэбна-метадычныя комплексы, даступныя на інфармацыйна-адукацыйным інтранэт-партале вышэйшага каледжа. Для падрыхтоўкі аўдыявізуальнага прадукту, здольнага папоўніць нязначны аб’ём аўдыторных заняткаў па профільных дысцыплінах і стварыць «эфект прысутнасці», кампенсаваўшы гуманістычны кампанент адукацыі, неабходна распрацоўка новых жанравых форм і педагагічных методык выкладання матэрыялу. У гэтай сувязі перспектыўным з’яўляецца стварэнне адзінай адукацыйнай медыяпрасторы з удзелам устаноў вышэйшай адукацыі рэспублікі.

Зараз адукацыйнае тэлебачанне ў розных фарматах развіваецца ў Інстытуце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава, Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце, Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Куляшова, некаторых іншых навучальных установах. На наш погляд, патэнцыял выкарыстання медыятэхналогій у многіх няпрофільных установах не рэалізуецца праз неразуменне таго, якое месца ў структуры ўстановы здольныя заняць лакальныя сродкі масавай камунікацыі, а таксама памылковага ўяўлення адносна іх затратнасці. Таму тэарэтычная мадэль інтэграцыі вучэбнага тэлебачання ў адукацыйны працэс ва ўмовах адсутнасці медыяспецыялізацыі і яе практычная рэалізацыя ў Магілёўскім вышэйшым каледжы МУС Рэспублікі Беларусь могуць быць выкарыстаны ў якасці «дарожнай карты» гэтага працэсу.